# КЛЮЧЫ ДА ПРАКТЫКАВАННЯЎ

***Практыкаванне 4***

**Цана слова**

Правілы маўлення складаліся ў народзе стагоддзямі. Яны былі сціслыя памерам, мелі форму прыказкі, прымаўкі, загадкі, фразеалагізма. У іх адбіўся калектыўны вопыт нашых продкаў.

Народ уважліва выпрацоўваў правілы карыстання словам. Шмат якія прыказкі і прымаўкі вучаць паводзінам у гутарцы. Народная мудрасць падказвае, як слухаць суразумоўніка і рэагаваць на яго словы, чаму трэба быць стрыманым у час размовы, як трэба ўлічваць абставіны маўлення. Перш чым нешта сказаць, трэба падумаць, узважыць кожнае слова.

Каб належным чынам весці гутарку, трэба ўмець слухаць таго, з кім гаворыш. Гутарка з людзьмі – крыніца звестак, ведаў, уменняў (паводле А. Каўруса).

***Практыкаванне 8***

Правільнымі з’яўляюцца сцвярджэнні 1, 3, 6, 9.

***Практыкаванне 45***

1. Стадыён. 2. Чэмпіён. 3. Чэмпіянат. 4. Спартакіяда. 5. Стаер. 6. Дыета. 7. Біятлон. 8. Перыяд. 9. Алімпіяда. 10. Юніёр.

***Практыкаванне 51***

Табе, канечне, даводзілася чуць, што радзіма хакея – Канада. Сапраўды, першы афіцыйны хакейны матч адбыўся ў 1879 г. у «Краіне кляновага ліста» (кляновы ліст выяўлены на канадскім дзяржаўным сцягу). Але ж і ў таго першапачатковага хакея былі вытокі.

Гульні, якія нагадвалі хакей, існавалі са старажытных часоў. Такую гульню ведалі ў Кітаі яшчэ чатыры з паловай тысячы гадоў назад. Хакейнымі паядынкамі захапляліся і старажытныя індзейцы. Сведчаннем гэтаму з’яўляюцца фрэскі, якія экспануюцца ў Нацыянальным антрапалагічным музеі Мехіка. На іх выяўлены спартсмены, якія гуляюць у невялікі шар сагнутымі палкамі. Некаторыя крыніцы сцвярджаюць, што нараджэнне хакея з шайбай звязана з жыццём індзейцаў крайняй поўначы Амерыкі. У аналагічныя ж гульні ў Еўропе гулялі ўжо ў XVI ст. Галандцы, напрыклад, лічаць, што менавіта іх краіна з’яўляецца радзімай хакея.

Калі ж звярнуцца да моваведаў, то яны паведамяць, што слова «хакей» – французскага паходжання. «Хокэ» – так на французскай мове гучыць назва посаха пастухоў з загнутай ручкай.

Бачыш, як лёгка заблытацца ў пошуках заснавальнікаў любімай гульні (А. Ісаеў).

***Практыкаванне 56***

1. П’ер дэ Кубертэн. 2. Франц Бекенбаўэр. 3. Хуан Антоніа Самаранч. 4. Уле-Эйнар Б’ёрндален. 5. Кененіс Бікеле. 6. Мухамед Алі. 7. Пеле. 8. Уэйн Грэцкі. 9. Караліна Клюфт. 10. Майкл Фэлпс.

***Практыкаванне 93***

1) Можа, хтосьці здзівіцца, але ж ганяць шайбу па лёдзе прадстаўніцы прыгожага полу пачалі ўжо даўно – у 1889 годзе, вядома ж, у Канадзе. Першымі дамамі, якія сур’ёзна ўзяліся за клюшкі, былі жонка і дочкі знакамітага спадара Стэнлі. Праўда, прафесійныя жаночыя каманды з’явіліся значна пазней, а першы міжнародны турнір адбыўся толькі ў 1987 годзе.

2) У якасці пакрыцця беларуская каманда выбрала хард, таму матчы чакаюцца хуткімі і, спадзяёмся, стануць пераможнымі для нашай каманды.

3) Страх быў, напэўна, толькі ў дзяцінстве, а калі ты ўсё жыццё гэтым займаешся, то атрымліваеш ад спуску са схілу толькі задавальненне (з інтэрв'ю з Марынай Шканавай).

4) Самы прыгожы і, напэўна, самы вытанчаны від воднага спорту, у якім разам сплецены гімнастычныя практыкаванні, танцавальныя рухі і нават балетныя трукі, сабраў у Палацы воднага спорту неабыякавых да атлетычнай прыгажосці.

5) Бясспрэчна, самай яркай падзеяй Алімпійскіх гульняў 2016 года для ўсіх беларусаў стала выступленне батутыста Уладзіслава Ганчарова, які прынёс у скарбонку краіны адзіную залатую ўзнагароду. У фінальным скачку ён абыграў самых прынцыповых сапернікаў – кітайцаў – і ўпершыню ў гісторыі беларускага спорту заваяваў алімпійскі медаль у гэтым відзе праграмы.

6) Стаўшы часткай легенды, Канстанцін Шаравараў застаў залаты час мінскага клуба са СКА, выйграў самыя прэстыжныя тытулы, а акрамя гэтага са зборнай Савецкага Саюза заваяваў алімпійскае золата ў Сеуле.

7) У нашай дружыны ў нядзельны вечар не атрымлівалася нічога: раз-пораз правальвалася абарона, кідкі задняй лініі часта не даходзілі да мэты, не дапамагалі і галкіперы.

8) Дарэчы, у масавым гіравым спорце беларусы зараз найлепшыя ў свеце, ім належаць дасягненні ва ўсіх пяці намінацыях, якія прызнаны лонданскай штаб-кватэрай Кнігі рэкордаў Гінеса.

9) Пакуль я задаволеная той рабочай атмасферай якая склалася ў калектыве. Усе дзяўчаты працуюць з поўнай самааддачай, і гэта не можа не радаваць. Трэнерскі штаб у сваю чаргу стараецца разнастаіць трэніровачны працэс, зрабіць яго максімальна насычаным і цікавым. Робім акцэнт на тым, каб звыклая манатонная і цяжкая агульная фізічная падрыхтоўка праходзіла не толькі інтэнсіўна, але і ўключала ў сябе шмат новых развіваючых практыкаванняў, – пракаменціравала Наталля Трафімава.

10) У свае 19 Мікіта Цыркун здабыў пуцёўку на Гульні і ўвайшоў у 30 самых лепшых віндсёрфінгістаў свету, што зусім нядрэнна для прадстаўніка краіны, якая не мае выхаду да мора. У дзяцінстве хлопец сур'ёзна захапляўся шахматамі, адчуваў цягу да дакладных навук, а цяпер ён скарае хвалі.

***Практыкаванне 94***

Дзясяткі разоў Вадзік чуў гэтую музыку, і кожны раз, калі яна гучала (выходзіў ён на поле ці не), яго бралі дрыжыкі. У футбольным маршы ён, здаецца, бачыў імклівыя рыўкі ігракоў, акрабатычныя скачкі варатароў, пругкі лёт мяча… А яшчэ ў гэтых акордах яму чулася радасць перамогі і светлая надзея. Не раз у шумлівай кампаніі ён бачыў, як сціхалі, пачуўшы з рэпрадуктара гукі марша, здаровыя дзецюкі і важныя мужы супакойвалі другіх: «Ціха! Дайце паслухаць!»

Марш запоўніў чашу стадыёна, ацішыў гул балельшчыкаў. Каманды выбягалі ў цэнтр, выстройваліся з двух бакоў суддзяў.

Апошнія акорды марша, здаецца, заклікалі да барацьбы, барацьбы сумленнай і цяжкай, барацьбы да апошніх сіл…

Вадзік зірнуў на поле: ігракі прывітальна памахалі балельшчыкам, разышліся на свае палавіны. Суддзя паставіў мяч на цэнтр, зірнуў на секундамер, кінуў погляд на аднаго капітана каманды, затым на другога – тыя паднялі правыя рукі ўверх: усё гатова, можна пачынаць.

Над ціхім стадыёнам рэзка прагучаў судзейскі свісток (А. Камароўскі).

***Практыкаванне 122***

1) Каманды пачалі гульню асцярожна, *з аглядкай*. 2) У пачатку гульні трэнеры не спяшаюцца выяўляць свае намеры, *адкрываць свае карты*. 3) У час спаборніцтваў па

мастацкай гімнастыцы гледачы *не адрываюць вачэй* ад памоста. 4) Кідок з-за трохметровай лініі стаў *заключным акордам* гэтай гульні. 5) Трэнер выпусціў на пляцоўку самых моцных нападаючых, сапраўдную *цяжкую артылерыю*. 6) Гэты спецыліст стаў сапраўдным *хросным бацькам* для многіх маладых спартсменаў. 7) У час спаборніцтваў па лёгкай атлетыцы ў гледачоў проста *вочы разбягаюцца* ад значнай колькасці падзей. 8) Пасля стартавага стрэлу спрынтары пабеглі *з усіх ног*. 9) На пляцоўцы ўзнікаюць сутычкі, *атмасфера* на матчы *накаляецца*. 10) Ён удзельнік некалькіх алімпіяд і чэмпіянатаў свету, можна сказаць, сапраўдны *стрэляны верабей*.